УДК 37.013.8

***А.Л. МІХАЙЛАВА***

# МЕТАДЫ ФАРМІРАВАННЯ МАРАЛЬНА І ФІЗІЧНА ЗДАРОВАЙ АСОБЫ Ў БЕЛАРУСКАЙ НАРОДНАЙ ПЕДАГОГІЦЫ

*Працэсы фарміравання маральнага і фізічнага здароўя асобы ў беларускай народнай педагогіцы маюць агульны спектр метадаў. Артыкул прадстаўляе магчымасць класіфікацыі метадаў народнай педагогікі беларусаў паводле прынцыпу выходнай ініцыятывы. Метады ініцыятывы "акружэнне Я", метады ініцыятывы "Я", метады ўзаем-*

Могилевский государственный университет имени А.А. Кулешова

*най ініцыятывы разам спрыяюць устанаўленню пэўных маральных паняццяў, перакананняў і пачуццяў дзяцей; выхоўваюць у асобы пэўныя рысы маральнага і фізічнага ідэалу: працавітасць, дабрыню, чэснасць і праўдзівасць, акуратнасць, ашчаднасць, уважлівасць, фізічную моц, вытрымку і інш.; з'яўляюцца своеасаблівым рэгулятарам паводзін і перакананняў асобы; спрыяюць фарміраванню свядомасці і ўстанаўленню пэўнага тыпу паводзін.*

*Такім чынам, відавочна, што беларуская народная педагогіка мае багаты метадычны патэнцыял, які здольны ўплываць на фарміраванне маральнага і фізічнага здароўя асобы.*

У педагагічнай думцы беларускага народа надзвычай значнай з'яўляецца ідэя дасканалага чалавека, ідэальнага ва ўсіх адносінах. З яе магчыма вылучыць **маральны ідэал**, у аснову якога пакладзены працавітасць, патрыятызм, гуманізм, дабрыня, чэснасць і праўдзівасць, сумленнасць, павага да людзей, гонар і ўласная годнасць, і **фізічны ідэал**, што ўвабраў у сябе ўяўленні беларускага народа пра ідэал абаронцы Айчыны, якому ўласцівы фізічная моц і вытрымка, уласная годнасць, упэўненасць, праўдзівасць, справядлівасць. Маральны і фізічны ідэал беларускага народа – гэта своеасаблівая канчатковая мэта працэсаў фарміравання маральнага і фізічнага здароўя асобы, а таксама кодэкс народнай педагогікі, што ўключае ў сябе сукупнасць патрабаванняў да чалавека, правілаў і норм паводзін, занатаваных ў розных відах вуснай народнай творчасці: казачным эпасе; міфах і паданнях; прыказках, прымаўках і фразеалагізмах; песнях, у тым ліку ў дзіцячым песенным фальклоры; анекдотах і жартах.

Шматвяковая практыка народнага выхавання не толькі вылучыла аспекты фарміравання чалавечай асобы, але і падала метады, што дапамагалі народу ў дасягненні мэты выхавання. Імі традыцыйна карысталіся беларусы, перадаючы свой вопыт з пакалення ў пакаленне, нягледзячы на тое, што дадзеныя правілы выхавання не былі навукова сфармуляваны і даследаваны. Выхавальнікі спачатку гаварылі, тлумачылі, паказвалі, пераконвалі сваіх выхаванцаў, затым давалі пасільныя даручэнні, каб замацаваць растлумачанае альбо паказанае, калі дзіця выконвала даручаную справу няякасна, то патрабавалі, каралі адмовай у чым-небудзь альбо фізічна, у адваротным выпадку хвалілі, заахвочвалі і г.д. Абавязковай умовай выхавання была праверка адпаведных якасцей асобы выхаванца, яго ведаў, уменняў і навыкаў з дапамогай розных іспытаў, якія бяруць свой пачатак у першабытным грамадстве.

Зыходзячы з дадзенага вопыту, беларускі народ сфармуляваў у прыказках і прымаўках своеасаблівыя "метадычныя" рэкамендацыі, якія забяспечвалі поспех у прымяненні народна-педагагічных метадаў: 1) выхоўваць змалку ("Тады дзяцей вучаць, як каля лаўкі ходзяць", "Да пяці год пястуй дзіця, як яечка, з сямі пасі, як авечку, тады выйдзе на чалавечка", "Калі тонкага дрэва не сагнеш, то тоўстага не адужаеш"); 2) сур'ёзна адносіцца бацькам да справы выхавання ўласных дзяцей ("Дзетак узгадаваць – не грыбкоў назбіраць", "Нягоднік не родзіцца, а робіцца", "Твае дзеці – табе і глядзеці", "Што ў дзяцінстве выхаваеш, на тое ў старасці абапрэшся"); 3) выхавальніку трэба быць узорам для сваіх выхаванцаў ("Ад добрага кораня – добры і сучок", "У добрых бацькоў і дзеці добрыя", "Маладыя ад старых вучацца"); 4) быць шчырым, добразычлівым у адносінах да іншых ("Як паклічаш, так і адгукнуцца", "Да чыстай крыніцы сцежка ўтаптана", "Не той чалавек, што грошы мае, а той чалавек, што няпраўды не мае"); 5) быць гаспадаром сваіх слоў і дзеянняў ("Добры чалавек параіўшы, не шкадуе", "Умеў памыліцца, умей і паправіцца").

Народ выпрацаваў на працягу свайго гістарычнага развіцця шэраг метадаў, якія здольны сфарміраваць здаровую ў маральных і фізічных адносінах асобу.

Могилевский государственный университет имени А. А. Кулешова

Адзін з аснавальнікаў беларускай народнай педагогікі – Г.П. Арлова – вылучыла і дала навукова-метадычнае апісанне наступным метадам выхавання, уласцівым беларусам: праца, прыклад і аўтарытэт, назіранне, гульня, наказ, перакананне, парада, прывучэнне, унушэнне, тлумачэнне, распавед, гутарка, іспыт, спаборніцтва, практыкаванне, грамадская думка, ушчуванне, заахвочванне і ўхваленне, благаславенне, асуджэнне, пакаранне, вымова, пагроза, праклён [1, с. 18].

Разгляд народна-педагагічных метадаў і іх класіфікацыя паводле прыметы выходнай ініцыятывы надзвычай важныя для пабудовы працэсаў фарміравання маральнага і фізічнага здароўя асобы. У беларускай народнай педагогіцы існуе шэраг умоў, што вызначаюць фарміраванне маральнага здароўя асобы: 1) *натуральныя, прыродныя дадзеныя, асаблівасці арганізма і цэнтральнай нервовай сістэмы* пэўнай асобы; 2) *сацыяльныя ўмовы* (сям'я, гэта значыць пэўны тып узаемаадносін яе членаў, і акружэнне асобы: калегі па працы, сябры, суседзі, вяскоўцы і г.д.); 3) *сам суб'ект*, што фарміруе сваё здароўе ў мэтанакіраванай дзейнасці шляхам развіцця ўласнай волі і пераадольваючы шэраг шматлікіх унутраных і знешніх супярэчнасцей.

Такім чынам, прапануем класіфікацыю метадаў беларускай народнай педагогікі паводле прыметы выходнай ініцыятывы ў працэсе фарміравання маральнага і фізічнага здароўя асобы, што складае тры групы: метады ініцыятывы "акружэнне Я", метады ініцыятывы "Я", метады ўзаемнай ініцыятывы:

1. Метады ініцыятывы "акружэнне Я": прыклад і аўтарытэт, наказ, перакананне, парада, прывучэнне, унушэнне, тлумачэнне, распавед, грамадская думка, заахвочванне і ўхваленне, асуджэнне і ўшчуванне, благаславенне, пакаранне, вымова, пагроза, праклён.

2. Метады ініцыятывы "Я" (у залежнасці ад узросту асобы, што фарміруецца, узроўня сфарміраванасці яе валявых якасцей, мэтанакіраванасці, сталасці яе матывацыйнай сферы некаторыя метады ініцыятывы "акружэнне Я" могуць пераходзіць у дадзеную групу з прыстаўкай *сама-*): назіранне; самаўнушэнне, самаперакананне, самапрывучэнне, самаўшчуванне, самаўхваленне, самаасуджэнне, самапакаранне.

3. Метады ўзаемнай ініцыятывы: гутарка, спаборніцтва, праца, гульня, іспыт, практыкаванне (гл. табл. 1).

Метады ініцыятывы "акружэнне "Я" з'яўляюцца своеасаблівым рэгулятарам паводзін і перакананняў асобы, уздзейнічаючы на свядомасць выхаванца. Яны маюць на мэце выпрацаваць у дзіцяці разуменне значэння той якасці, якую яму імкнуцца прывіць; спрыяюць устанаўленню і фарміраванню пэўных маральных паняццяў, перакананняў і пачуццяў дзяцей, а таксама пэўных рыс маральнага і фізічнага ідэалу: працавітасці, дабрыні, чэснасці і праўдзівасці, акуратнасці, ашчаднасці, уважлівасці, фізічнай моцы, вытрымкі і інш.

Метады ініцыятывы "Я" спрыяюць з'яўленню і станаўленню ў выхаванца адказных адносін да сябе як асобы, да фарміравання ўласнага маральнага і фізічнага здароўя, бо пэўны тып паводзін асобы заснаваны на яго ўласных перакананнях, якія ўзнікаюць і замацоўваюцца пад уплывам метадаў ініцыятывы "акружэнне Я".

Метады ўзаемнай ініцыятывы спрыяюць фарміраванню свядомасці асобы і ўстанаўленню пэўнага тыпу яе паводзін у грамадстве. Дадзеная група метадаў амаль цалкам заснавана на практычнай дзейнасці выхаванца, якая з'яўляецца яго ініцыятывай або якой патрэбна кіраваць.

Такім чынам, у працэсах фарміравання маральнага і фізічнага здароўя асобы метады народнай педагогікі беларусаў узаемадзейнічаюць праз выкананне агульных мэт і задач працэсаў у асноўных спосабах іх выражэння.

Могилевский государственный университет имени А.А. Кулешова

*Табліца 1*

**Класіфікацыя народна-педагагічных метадаў фарміравання маральнага і фізічнага здароўя асобы**

| Метады ініцыятывы "акружэнне Я" | Метады ініцыятывы "Я" | Метады амбівалентнай ініцыятывы |
|---|---|---|
| прыклад і аўтарытэт<br>тлумачэнне<br>парада<br>расповед<br>перакананне→<br>прывучэнне →<br>унушэнне →<br>заахвочванне →<br>ухваленне →<br>ушчуванне →<br>асуджэнне →<br>пакаранне →<br>грамадская думка<br>наказ<br>благаславенне<br>вымова<br>пагроза<br>праклён | назіранне<br>самаперакананне<br>самапрывучэнне<br>самаўнушэнне<br>самазаахвочванне<br>самаўсхваленне<br>самаўшчуванне<br>самаасуджэнне<br>самапакаранне | гутарка<br>спаборніцтва<br>праца<br>гульня<br>іспыт<br>практыкаванне |

## ЛІТАРАТУРА

1. ***Арлова, Г.П.*** Беларуская народная педагогіка / Г.П. Арлова. – Мн., 1993. – 92 с.
2. ***Болбас, В.С.*** Метады і сродкі маральнага выхавання ў народнай педагогіцы беларусаў / В.С. Болбас // АіВ. – 2000. – № 10. – С. 14-19.
3. ***Грымаць, А.*** Народная педагогіка беларусаў / А. Грымаць, Л. Варанецкая, У. Пашкевіч. – Мн., 1999.
4. ***Крываносава, А.Э.*** Асноўныя сродкі і метады маральнага выхавання ў народнай педагогіцы беларусаў / А.Э. Крываносава // Веснік ВДУ. – 1998. – № 3(9). – С. 21-26.
5. Народная педагогіка беларусаў / У.М. Конан [і інш.]. – Мн., 1996. – 123 с.
6. ***Ракава, Л.В.*** Традыцыі сямейнага выхавання ў беларускай вёсцы / Л.В. Міхайлава. – Мн., 2000. – 112 с.

Паступіў у рэдакцыю 26.12.2005.

Могилевский государственный университет имени А.А. Кулешова